# "МНЕ СНЯЦЦА СНЫ АБ БЕЛАРУСІ..."

## ТАЯМНІЦА СМЕРЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ



Гэтыя радкі з верша Янкі Купалы былі напісаны на паперы, што ляжала на труне 70 гадоў таму 1 ліпеня 1942 г., калі адбывалася развітанне з народным песняром у Маскве.

У даследчыцкай працы важныя кожная звестка, кожны штрых да біяграфіі знакамітага чалавека. Асабліва калі яны тычацца невядомых фактаў ці таямнічых падзей. Так сталася, што менавіта загадка смерці Янкі Купалы не была дастаткова асветлена ў экспазіцыі музея класіка беларускай літаратуры. На пачатку XXI ст. узнікла неабходнасць пашырыць і зрабіць больш сучасным раздзел "Вялікая Айчынная вайна ў жыцці і творчасці Янкі Купалы", дзе асвятлялася і тэма смерці народнага паэта. У 2007 г. задума ажыццявілася. У экспазіцыі былі прадстаўлены каштоўныя артэфакты таго часу: дзверы пакоя № 414 з гасцініцы "Масква", дзе правёў апошнія дні свайго жыцця Іван Дамінікавіч, міжпакаёвыя дзверы, рама вакна, частка прыступак, парэнчаў, паркету і інш. Матэрыялы паступілі ў музей пасля рэканструкцыі гасцініцы і з іх дапамогай, а таксама дзякуючы дакументам ваеннага часу, стала магчымым зрабіць прасторавую кампазіцыю і дапоўніць тэматыку залы многімі новымі экспанатамі. І вось ужо пяць гадоў у музеі дзейнічае экспазіцыйны комплекс "Таямніца смерці Янкі Купалы", дзе праводзяцца тэматычныя экскурсіі, цікавасць наведвальнікаў да гэтай тэмы не знікае.

Смерць народнага паэта была трагічнай: пры нявысветленых абставінах 28 чэрвеня 1942 г. у 22.30 ён упаў з дзясятага паверха гасцініцы "Масква" ў лесвічны пралёт... Існуюць тры версіі прычын яго гібелі, якія падаваліся рознымі даследчыкамі ў публікацыях: няшчасны выпадак, спроба самагубства і, магчыма, забойства. Кожная з версій абмяркоўвалася на старонках друку, але тэма трагічнай смерці Янкі Купалы доўгі час заставалася практычна закрытай і недастаткова вывучанай. Упершыню яе ўзняў вядомы беларускі пісьменнік і даследчык Барыс Сачанка, які выдаў кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў "Сняцца сны аб Беларусі..." [1], дзе выкарыстаў некаторыя матэрыялы з фондаў музея Янкі Купалы.

Ствараючы новы экспазіцыйны комплекс, мы звярталіся да ўспамінаў, друкаваных звестак, эпісталярнай спадчыны беларускіх пісьменнікаў. Некаторыя з гэтых сведчанняў захоўваюцца ў фондах музея Янкі Купалы, пазней яны былі апублікаваны на старонках зборнікаў "Такі ён быў" (1975) і "Успаміны пра Янку Купалу" (1982). Успаміны сучаснікаў дадаюць асобныя штрыхі да разумення псіхалагічнага стану Янкі Купалы ў той час, яго стасункаў з пісьменнікамі, творчых задум; яны захоўваюць звесткі пра апошні дзень ці нават апошнія гадзіны яго жыцця, пра пахаванне паэта.

...Янка Купала прыехаў у Маскву з пасёлка Пячышчы з-пад Казані Татарскай АССР напярэдадні свайго 60-гадовага юбілею – 18 чэрвеня 1942 г. па выкліку ўрада. Сустрэча з беларускімі і рускімі пісьменнікамі, сябрамі была радаснай, пра што ён паведамляў у апошнім лісце ад 19 чэрвеня да жонкі Уладзіславы Францаўны. Ён запрашаў усіх на свой юбілей, які ў хуткім часе планаваў святкаваць. Пятрусь Броўка, успамінаючы пра сустрэчу з Янкам Купалам і Аляксандрам Твардоўскім у нумары 414 гасцініцы "Масква", адзначаў цікавасць паэта да ўсенароднай партызанскай барацьбы, да апошніх баявых падзей, згадваў яго настрой, які ў адрозненне ад першых дзён вайны быў больш бадзёрым: «Ён

нават прачытаў свой славуты верш "Беларускім партызанам". Вельмі спадабаўся яму ўрывак з "Васіля Цёркіна", які прачытаў Твардоўскі. Час ад часу Купала ўсё вяртаўся ў размовах да роднай Беларусі. Быў у добрым настроі. Спадзяваўся хутка вярнуцца дахаты. Нават планаваў, што ён будзе рабіць па прыездзе. Бясспрэчна, успамінаў Ляўкі. І маці, маці, якую ён меў надзею яшчэ пабачыць…» [2, с. 112]. На развітанне Янка Купала сказаў, што праз некалькі дзён яму споўніцца шэсцьдзесят гадоў і запрасіў на святкаванне, на што госці з радасцю пагадзіліся "адзначыць славутую дату песняра, любага нам чалавека…" [2, с. 113].

Рускі пісьменнік Яўген Мазалькоў пісаў пра сустрэчу з Янкам Купалам днём 28 чэрвеня 1942 г., за некалькі гадзін да гібелі паэта, ва ўспамінах "Старонкі вялікага жыцця": "Іван Дамінікавіч сустрэў мяне неяк асабліва ласкава, цёпла, абняў, пацалаваў… Я расказаў Івану Дамінікавічу, што ў дзіцячым выдавецтве толькі што выйшла, складзеная мною, кніга яго вершаў. Для яго гэта было прыемнай нечаканасцю. Адчувалася, што ён шчыра ўзрадаваўся…" [3, с. 250 – 252]. Далей аўтар згадваў, як яны дамовіліся сустрэцца на наступны дзень у выдавецтве, як паэт запрашаў на юбілей праз тыдзень, частаваў цукеркамі. Янка Купала распавядаў Я. Мазалькову пра сустрэчу ў Маскве з сябрамі, з многімі паплечнікамі, землякамі-беларусамі. Падчас той размовы зазваніў тэлефон, паэта запрашалі на дзясяты паверх, дзе яго чакалі сябры…

Звернемся да радкоў Кандрата Крапівы з успамінаў "У памяці і ў сэрцы", у якіх ён распавядае пра сустрэчу з Янкам Купалам за гадзіну да яго трагічнай смерці ў нумары Міхася Лынькова, дзе акрамя іх было яшчэ некалькі знаёмых. К. Крапіва адлучыўся на кароткі час, а калі вярнуўся, яго "як громам паразіла вестка: Янка Купала загінуў. У глыбокім смутку мы разам з нашымі маскоўскімі сябрамі правялі ў апошні шлях слаўнага сына беларускага народа, імя якога дарагое кожнаму народу нашай вялікай Радзімы.

У 1962 г. было прынята рашэнне перавезці урну з прахам паэта на родную зямлю. Ехаць па яе было даручана Петрусю Броўку і мне" [2, с. 80].

Сярод сведчанняў пра сустрэчы з беларускім паэтам у Маскве ёсць адно, дзе гучаць надзвычай шчымлівыя словы беларускага песняра. Імі завяршыў свае ўспаміны "Наш Янка" рускі пісьменнік Б. Емяльянаў, добры сябра паэта: "Вось скончыцца вайна, пройдзе некалькі год… Вырастуць новыя сады. Чаранок ад падмаскоўнай яблыні мне пашлі. А калі мяне не будзе, пасадзі яблыню на магіле…" [3, с. 309].

Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, жонка паэта, пісала, як у Пячышчах Янка Купала даведаўся пра смерць свайго паплечніка, пісьменніка Змітрака Бядулі: "…я не адважвалася расказаць Янку аб смерці Бядулі. Але хутка аб гэтым паведаміла радыё.

Янка доўга хадзіў з канца ў канец пакоя, курыў і маўчаў, як заўсёды, калі глыбока хваляваўся і перажываў. Толькі калі прыйшоў наш знаёмы дырэктар завода Наякшын, Купала сказаў:

– Не дачакаўся Бядуля звароту на сваю зямлю. Не ведаю, ці вярнуся і я…" [4, с. 470].

Значна пазней, пасля трагічнай смерці Івана Дамінікавіча, Уладзіслава Францаўна гаварыла з горыччу, што ўсюды яна з ім ездзіла, ніколі не адпускала аднаго, а вось упершыню ён паехаў адзін – і здарылася такое няшчасце. Яна не магла сабе гэтага дараваць, пра што ўспамінаюць многія яе сучаснікі, і часта паўтарала: "Чаму і навошта я адпусціла яго аднаго?"

Сучасныя даследчыкі зазначаюць, што ў наш час моцна акцэнтуецца ўвага на трагічным завяршэнні жыцця Янкі Купалы, вакол чаго існуе шмат домыслаў, меркаванняў і разважанняў. Безумоўна, нельга адмаўляць жаданне многіх даведацца як мага болей аб прычынах гібелі паэта і імкненне высвятліць усе абставіны. У апошнія гады з'явіліся публікацыі, дзе прыводзяцца і некаторыя сумнеўныя звесткі. Калі параўноўваць іх з успамінамі больш ранняга часу, то робяцца відавочнымі пэўныя разыходжанні, відаць, многае забылася, а ў час вайны пра трагічнае не хацелася пісаць. Так, у пазнейшых успамінах ёсць згадкі і пра нейкую жанчыну на пляцоўцы побач з паэтам, і пра яго нібыта нецвярозы стан, і пра людзей у кепках, якія збягалі па лесвіцы, і пра многае іншае, аднак дакументальнага пацвярджэння гэтая інфармацыя не мае.

Працуючы над тэмай таямніцы смерці Янкі Купалы, супрацоўнікі нашага музея вырашылі пераглядзець перапіску беларускіх пісьменнікаў ваеннага часу – сярэдзіны і другой паловы 1942 г. у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва: можа, нехта згадваў па гарачых слядах пра тыя трагічныя падзеі?

Зразумела, што больш за ўсё цікавіла перапіска літаратараў, якія сустракаліся з Я. Купалам у Маскве і прысутнічалі на яго пахаванні. З прагледжаных фондаў звесткі пра народнага паэта Беларусі былі знойдзены ў архівах пісьменнікаў М. Лынькова, І. Барашкі, А. Кучара, спявачкі Л. Александроўскай.

Каштоўныя матэрыялы знайшліся ў фондзе тагачаснага старшыні Саюза пісьменнікаў БССР

Міхася Лынькова. Гэта пратакол пахавання Янкі Купалы, лісты з упамінаннем падзей лета 1942 г., дзе ўтрымліваліся важныя для нас звесткі.

У архіве М. Лынькова сярод лістоў да Якуба Коласа ёсць неацэнныя факты, якія пацвярджаюць, што Іван Дамінікавіч у той час не злоўжываў спіртным. Хоць у афіцыйным спецпаведамленні на імя Берыі (копіі Сталіну і Молатаву) ад 29 чэрвеня 1942 г. за № 1154/6, падпісаным начальнікам трэцяга ўпраўлення НКУС СССР Гарлінскім [5], дзе, дарэчы, Янка Купала названы Луцкевічам, было напісана, што падчас трагедыі ў гасцініцы "Масква" ён знаходзіўся ў нецвярозым стане. Да нас у музей ксеракопія гэтага спецпаведамлення трапіла ў 1996 г. з ФСБ Расійскай Федэрацыі ў адказ на запыт Міжнароднага фонду Янкі Купалы і музея народнага песняра. Сёння дакумент экспануецца ў раздзеле "Вялікая Айчынная вайна ў жыцці і творчасці Янкі Купалы".

Аднак вось што пісаў Міхась Ціханавіч Лынькоў летам 1942 г. з Масквы ў Ташкент Якубу Коласу: "18-га чэрвеня прыехаў у Маскву Янка, гасцюе цяпер у нашай гасцініцы. Не п'е гарэлкі, спажывае толькі піва. Гэта ўжо добра..." [6].

У лісце ад 11 ліпеня 1942 г. да пісьменніка Ілар'я Барашкі М. Лынькоў так апісвае трагедыю, якая адбылася ў гасцініцы "Масква": "...у нас тут случилось большое несчастье – приехал к нам на несколько дней Янка Купала, у нас же и умер. Был он у меня в номере за три минуты до своей смерти. Было у нас много горя, много хлопот. Огрубели мы немного от этой проклятой войны, так что толком ещё и не осмыслили всей глубины нашей невозвратимой потери, как никак лишились мы старейшины нашей белорусской литературы. Уходит постепенно старая гвардия. Осенью прошлого года где-то в поезде под Уральском умер Змитрок Бядуля" [7]. Далей М. Лынькоў піcаў: "Янку Купалу похоронили мы 1-го июля. Числа 3-го приехала его жена Владислава Францевна. Она не успела приехать к похоронам. Пришлось много повозиться нам, утешая её в постигшем горе" [8].

Ёсць успаміны Паўліны Мядзёлкі пра пахаванне Янкі Купалы. Частка з іх друкавалася ў часопісе "Полымя" (1993, № 4). У іх згадваецца і пра перанясенне часу пахавання, і пра незразумелыя тлумачэнні тых, хто быў на пахаванні, прычын смерці народнага паэта: хтосьці маўчаў, адварочваўся, а нехта гаварыў пра сардэчны прыступ...

І сёння цяжка чытаць пра тое, як Паўліна Вікенцьеўна з жонкай паэта пайшлі ў гасцініцу "Масква", аглядалі прыступкі і парэнчы, меркавалі, ці можна было з іх зваліцца, нават калі і быў у Купалы сардэчны прыступ, пра які ім сказалі. Сучаснікі адзначаюць, што ў гасцініцы былі дастаткова высокія і шырокія парэнчы, праз іх без чужой дапамогі перакуліцца было немагчыма, акрамя гэтага, пасля падзення паэта на прыступках застаўся адзін яго чаравік... А калі згадваеш, што Уладзіслава Францаўна не была на пахаванні, бо даведалася пра смерць дарагога чалавека толькі 30 чэрвеня і ва ўмовах ваеннага часу не паспела на развітанне з ім, падзея набывае надзвычай трагічнае гучанне.

У архіве М. Лынькова зберагаецца паштоўка ад 27.07.1942 г. пісьменніка І. Барашкі з Уладзівастока, гэта адказ на ліст Міхася Ціханавіча ад 11 ліпеня 1942 г., які ўжо цытаваўся. Аўтар з вялікім смуткам піша: «...узнав о смерти Янки, дорогие мои, я дня три ходил сам не свой. Ведь ровно год тому назад встречались в гостинице "Москва" в 1010 номере! Это была наша последняя встреча. А потом я уехал на Тихоокеанский флот. Как печально, что Янка ушёл в небытие. Ведь мы его любили...» [9].

Са спадзяваннем штосьці знайсці не толькі ў лістах, але і ва ўспамінах М. Лынькова мы пазнаёміліся з іх чарнавым рукапісам. Міхась Ціханавіч успамінаў: "...гэта быў ранейшы, радасны, бадзёры Купала... Праз якія некалькі дзён павінна была адкрыцца юбілейная ўрачыстасць 60-годдзя паэта. Гэтую гадавіну рыхтаваў урад, да яе рыхтаваўся паэт". Успаміны Лынькова напісаны кароткімі сказамі, на адвароце чарнавога аркуша – пацвярджэнне тагачаснага настрою паэта: "...быў вясёлы, радасны і ад непасрэднай блізкасці да юбілею" [10]. Напэўна, многія тады акцэнтавалі вясёлы настрой Янкі Купалы, каб пазбегнуць упамінання пра трагічнасць падзеі, але нельга аспрэчваць тое, што, магчыма, народны пясняр на самай справе быў рады сустрэчам з сябрамі і дзяліўся шматлікімі творчымі задумамі. Адносна юбілею Янкі Купалы, які павінен быў адбыцца 7 ліпеня 1942 г., у даследчыкаў ёсць меркаванні, што яго, у адрозненне ад юбілею Якуба Коласа, не планавалася шырока адзначаць.

Акрамя вышэйназваных матэрыялаў згадкі пра смерць Янкі Купалы знойдзены і ў архіве пісьменніка Алеся Кучара. У лісце без даты, напісаным простым алоўкам, малады на той час пісьменнік Юрый Багушэвіч, які знаходзіўся на фронце, пісаў А. Кучару: «Не так давно также в старом № "Правды" прочёл о тяжёлой утрате для Белоруссии – смерти дорогого "дядьки Янки" – как мы, молодёжь, привыкли называть незабвенного Янку Купалу. Затем мне передали, что будто бы умер и Змитрок Бядуля? Правда ли это?» [11]. У адным з лістоў А. Кучара згадваецца "трагічная смерць" Янкі Купалы, таму можна меркаваць, што ў пісьменніцкім асярод-

дзі раптоўная гібель народнага паэта, безумоўна, абмяркоўвалася і ўспрымалася менавіта як трагічная.

У архіўным фондзе знакамітай спявачкі, народнай артысткі СССР Ларысы Александроўскай сярод розных матэрыялаў (а гэта асобная папка, дзе захоўваюцца і некралогі паэта з газет, і паведамленне пра яго смерць) ёсць і тэрміновы выклік ад 29 чэрвеня 1942 г. на пахаванне Янкі Купалы. Народны паэт вельмі любіў творчасць таленавітай спявачкі, называў яе "беларускай перапёлачкай".

Па ўспамінах Л. Александроўскай, перад яе ад'ездам у складзе франтавой брыгады артыстаў у тыл ворага Янка Купала сказаў: "Доўга не затрымлівайся, я павінен табе нешта сказаць". І вось праз два дні – жахлівая вестка. Яна ўспамінае свой зварот у Маскву: "Не пакідалі думкі пра Купалу, пра тое, што яго няма сярод нас. Уздоўж дарогі віднеліся палі, сенажаці, лясы. На адным лузе ўсё было бялюткае ад рамонкаў. Спыніліся, шафёр набраў вады ў вядро, я назбірала кветак – цалюткае вядро. Іх у Маскве паклала ля труны Янкі Купалы…" [3, с. 225].

А ў першую гадавіну смерці паэта, якую адзначалі ў Маскве ў зале імя Чайкоўскага, Ларыса Александроўская спявала песні на словы народнага паэта Беларусі.

Згадкі пра смерць і пахаванне Янкі Купалы знайшліся і ў лісце народнага паэта Беларусі Максіма Танка да А. Каўкі, вядомага даследчыка беларускай літаратуры, які жыве ў Маскве. Немагчыма чытаць без хвалявання тое, што было ўбачана вачыма, прачута сэрцам і душой сучасніка. Ліст (чарнавік з праўкамі аўтара) напісаны 17 студзеня 1993 г., у ім аўтар звяртае ўвагу на пэўныя недакладнасці ў артыкуле, дзе А. Каўка піша пра смерць Янкі Купалы.

"У той трагічны дзень я быў у Купалы, у яго нумары", – пачынае свой аповед Максім Танк. Далей ён апісвае агульны выгляд пакоя № 414 гасцініцы "Масква", дзе жыў Янка Купала. Паводле ўспамінаў, хтосьці з хлопцаў ляжаў на канапе, Купала стаяў ля стала з нейкай ежай і шампанскім. Ён наліў два фужэры шампанскага, сваё разбавіў вадой, сказаўшы, што ўрачы забаранілі выпіваць: "Трэба перад 60-годдзем падлячыцца…" Як піша Максім Танк, "магчыма, гэта была апошняя чарка ў жыцці народнага паэта". Пасля ён развітаўся з Купалам і вярнуўся ў свой нумар, а паэт пайшоў на дзясяты паверх гасцініцы да М. Лынькова. Праз нейкі час М. Танку патэлефанаваў А. Астрэйка і паведаміў трагічную навіну. «Не чакаючы ліфта, я пабег па лесвіцы. На поручнях 5-6 павербаў нейкія эксперты сціралі пасыпаную нечым кроў, а на самым доле, дзе заўсёды сядзеў чысцільшчык абутку, прыбіральшчыцы моўчкі змывалі крывавыя плямы. Купалы ўжо не было…

Калі харанілі, труна была адкрыта. На папяровай стужцы навокал галавы былі напісаны словы паэта, якія сталі развітальнымі: "Мне сняцца сны аб Беларусі…" На правай скроні Купалы віднеўся пасінелы падцёк. На грудзях – ордэн Леніна, з якога, відаць, калі падаў, ад удару зляцела эмаль. Невялічкай грамадой, пад гук далёкіх зенітак праводзілі мы яго з Саюза пісьменнікаў да крэматорыя» [12].

У 1943 г. М. Танк напісаў верш з сімвалічнай назвай "28 чэрвеня" (дзень трагічнай гібелі паэта), апублікаваны ў газеце "Савецкая Беларусь" у чэрвені таго ж года, дзе ёсць словы:

Ты вечна будзеш сярод нас,
І непаўторнай тваё імя
Легендай стане у вяках,
Паходняй, што сваім праменнем
Паможа будучыні шлях
Прабіць наступным пакаленням.

Сёння застаюцца каштоўнымі любыя звесткі пра жыццё Янкі Купалы, іх мы асэнсоўваем пасучаснаму, па-новаму, шукаем у творчасці народнага песняра адказы на свае надзённыя пытанні.

Мы паспрабавалі прывесці некаторыя згадкі, успаміны і ўражанні беларускіх пісьменнікаў пра трагічную гібель паэта, але таямніца яго смерці па-ранейшаму застаецца неразгаданай. Спадзяёмся, наступныя пакаленні змогуць наблізіцца да яе раскрыцця, а мы на сёння можам толькі паўтарыць заключныя словы з ліста Максіма Танка: "Праўда пакуль што застаецца схаванай за сямю пячаткамі…"

**Спіс літаратуры**

1. **Сачанка, Б.** Сняцца сны аб Беларусі… / Б. Сачанка. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 332 с.
2. **Успаміны пра Янку Купалу** / склад. А. Кулакоўскі, Н. Цвірка; рэд. А. Разанаў, Г. Шупенька. – Мінск : Маст. літ., 1982. – 271 с.
3. **Такі ён быў** : успаміны пра Янку Купалу / склад. І. Жыдовіч. – Мінск : Маст. літ., 1975. – 349 с.
4. **Бядуля, З.** Выбраныя творы / З. Бядуля. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 496 с.
5. **Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы.** КП 18794 Д 2 – 29.
6. **Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва** (далей – БДАМЛМ). – Ф. 191. – Воп. 1. – Спр. 238.
7. **БДАМЛМ.** – Ф. 28. – Воп. 1. – Спр. 342.
8. **БДАМЛМ.** – Ф. 28. – Воп. 1. – Спр. 342.
9. **БДАМЛМ.** – Ф. 191. – Воп. 1. – Спр. 305.
10. **БДАМЛМ.** – Ф. 191. – Воп. 1. – Спр. 190.
11. **БДАМЛМ.** – Ф. 446. – Воп. 1. – Спр. 227.
12. **БДАМЛМ.** – Ф. 25. – Воп. 6. – Спр. 50.

**Фаіна ВАДАНОСАВА,**
вядучы навуковы супрацоўнік
Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.